Шыфр:______________________

Колькасць балаў:______________

Месца:________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі
_______________ К.С. Фарыно
«____»_______________2010 года

## III этап XXVII Рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў па беларускай мове і літаратуры

### Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

### 10 клас

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

### Варыянт 1

**Заданне 1.** Спалучыце паронімы *вадзяністы – вадзяны – водны* з адпаведнымі ім словамі.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| **Словы:** *выдра, знак, млын, па́ра, прастора, раствор, снег, спорт, чарніла, шлях.* | |
|---|---|
| *вадзяністы* | |
| *вадзяны* | |
| *водны* | |

**Заданне 2.** Размяжуйце *архаізмы* і *гістарызмы*. Да архаізмаў прывядзіце сучасныя адпаведнікі:

***Атрамант, веча, вярста, іспыты, ланіты, паморак, радца, рондаль, станавы прыстаў, ятвягі.***

*Максімальная колькасць балаў – 8 (за правільна вызначаны гістарызм – 0,5, за правільна вызначаны архаізм і яго сучасны адпаведнік – 0,5).*

| *Архаізмы:* | |
|---|---|
| *Сінонімы да архаізмаў:* | |
| *Гістарызмы:* | |

**Заданне 3.** Патлумачце фразеалагізмы і ўкажыце, як яны звязаны з мімікай і жэстыкуляцыяй.

*Максімальная колькасць балаў – 5 (за тлумачэнне фразеалагізма – 0,5, за сувязь фразеалагізма з паралінгвістычнымі сродкамі – 0,5).*

*1) вырачыць вочы:* ________________________________________________
____________________________________________________________
____________________________________________________________
____________________________________________________________
____________________________________________________________

*2) і брывом не павёў:*

*3) падняць галаву:*

*4) развесці рукамі:*

*5) раскрыць рот:*

**Заданне 4.** Назавіце прыкметы, якія аб'ядноўваюць вытворныя суфіксальныя словы ў групе *1* і *2*.

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

| **Група вытворных суфіксальных слоў** | **Прыкмета для аб'яднання** |
|---|---|
| **1)** *лісце, кацялок, беларуска, зубраня, канюк, шараваты, беленькі;* | |
| **2)** *сяброўства, чытач, гаспадарлівасць, каменны, лятук, багач, ільняны.* | |

**Заданне 5.** Адзначце, які(ія) з прыведзеных прыкладаў адпавядае(юць) наступнаму азначэнню: *«Сказ, у якім выражаецца значэнне павіннасці, неабходнасці, немагчымасці, непазбежнасці, пажаданасці, мэтазгоднасці дзеяння ці меркаванне адносна яго ажыццяўлення».*

Вызначце тып гэтых сказаў.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

| **Сказ** | **Тып сказа** |
|---|---|
| 1) Паслухаць бы драздоў свістанне ў час ружовага світання. | |
| 2) Пахам мядовым дыхнула ад дрэў. | |
| 3) На граніцы паласу барануюць, нібы ў полі. | |
| 4) Нам пройдзеных дарог не перамераць І нанава нікому не прайсці. | |
| 5) Там ліры гук і посвіст косаў Злучу ў адзін нячутны хор. | |

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ:____________________________________

**Заданне 6.** Кінастужка здымаецца на *«Беларусьфільме»*, калійныя мінеральныя ўгнаенні пастаўляе *«Беларуськалій»*, але грошы мы захоўваем у *«Беларусбанку»*. Чым можна растлумачыць асаблівасці правапісу назваў гэтых устаноў? Адказ аргументуйце.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

**Заданне 7.** Запішыце сказы, якія адпавядаюць прыведзеным схемам. Укажыце тыпы гэтых сказаў.

*Максімальная колькасць балаў – 10.*

**СХЕМА 1.** *[Здавалася], (нібы…).*

СКАЗ: ______________________________.

ТЫП: ______________________________.

**СХЕМА 2.** *[…], (дарма што…).*

СКАЗ: ______________________________.

ТЫП: ______________________________.

**СХЕМА 3.** *[…], (ажно…).*

СКАЗ: ______________________________.

ТЫП: ______________________________.

**СХЕМА 4.** *[…усё], (што…).*

СКАЗ: ______________________________.

ТЫП: ______________________________.

**СХЕМА 5.** *[…], (ці…).*

СКАЗ: ______________________________.

ТЫП: ______________________________.

**Заданне 8.** Запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – 9 (1 бал за правільны адказ).*

| **Род літаратуры** | **Аўтар** | **Сапраўднае імя** | **Твор** | **Жанр** | **Ідэя і яе ўвасабленне** |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | "Летапісец" | Філасофская лірыка | Зварот да культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі |
| Эпас | | | | Апавяданне | Суровая праўда пра першую сусветную вайну. Аўтабіяграфічнасць апавядання. Гуманізм. Вобраз Яна Шымкунаса |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Драма | Янка Купала | | | | Пошукі шляхоў вызвалення Бацькаўшчыны. Вобразы Сымона, Зосі, Старца, Незнаёмага. |

**Заданне 9.** Знайдзіце два адасобленыя элементы ў пераліку, якія не суадносяцца з іншымі тэрмінамі. Выбар абгрунтуйце.

*Максімальная колькасць балаў – 4 (2 балы за правільнае вызначэнне, 2 балы за тлумачэнне).*

*Паэма, барока, ямб, сентыменталізм, развязка, рамантызм, раман, камедыя, апавяданне, байка.*

АБГРУНТАВАННЕ: ____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

____________________________________________

**Заданне 10.** Устаўце прапушчаныя словы, запішыце назву твора і яго аўтара.

*Максімальная колькасць балаў – 7.*

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла...
Помніш, калі я ___________ з табою,
Зорка Венера ўзышла.
З гэтай пары я пачаў углядацца
Ў неба начное і зорку шукаў.
_______________каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.
Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.
Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
Ў сэрцы любоў __________ сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.
Глянь ____________________ раз на яе, – у расстанні
Там з ёй зліём мы ___________________ свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе...

НАЗВА ТВОРА: ____________________________________________

АЎТАР ТВОРА: ____________________________________________